**ACTA ALBARUTHENICA 22: 2022**
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Aliaksandr Makarevich, 2022
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-Bez utworów zależnych 3.0 PL
(CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.22.5

**Алесь Макарэвіч / Aliaksandr Makarevich**

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова, Беларусь /
Mogilev State A. Kuleshov University, Belarus
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-5836-4099
e-mail: olekmak@mail.ru

# Асаблівасці мастацкага свету трагедыі У. Караткевіча *Кастусь Каліноўскі (Смерць і неўміручасць)* як мастацкай версіі гістарычных фактаў

*Characteristics of the artistic world of the tragedy* Kastus Kalinouski (Death and immortality) *by U. Karatkevich as an artistic version of historical facts*
*Cechy świata przedstawionego tragedii U. Karatkiewicza* Kastuś Kalinouski (Śmierć i nieśmiertelność) *jako artystycznej wersji faktów historycznych*

**ABSTRACT**: The following elements of the play *Kastus Kalinouski (Death and Immortality)* by U. Karatkevich viewed as an artistic version of historical facts are characterized: 1) the time and place of the action; 2) the events and facts; 3) the historical figures; 4) the ideological position of the depicted historical figures and of the supporting characters; 5) the components of the author's artistic conception in revealing the essence of the historical figures and events. These indicators of the artistic world of the work prove the following. The playwright combines the depiction of the facts and events of the uprising led by K. Kalinovski and their historical authenticity (documentary text) with the pictures of human relationships, taking into account the motivation of interpersonal and civil actions, their essence and outcomes. Such an artistic reconstruction of the historical events and characters involved the expansion of the historical space within the boundaries possible at the time when the author was working on the tragedy, and the subjective filling of the play with a sense of the hypothetical truth about human nature in certain historical circumstances.

**KEYWORDS**: artistic world of play, tragedy *Kastus Kalinouski. Death and Immortality*, artistic version of historical facts, setting, events and facts, historical figures, ideological position of characters, elements of the author's artistic conception.

Мастацкая версія гістарычных фактаў – праблемнае адлюстраванне пэўных перыядаў жыцця і дзейнасці рэальнай гістарычнай асобы з характэрным для яго мастацкім вымыслам, эстэтычнай канцэпцыяй у адлюстраванні і вытлумачэнні фактаў жыцця рэальнай гістарычнай асобы ў кантэксце адпаведных абставін і сацыяльнага акружэння. Такія прататыпныя факты могуць быць агульнавядомымі або малавядомымі, выразнымі ў кантэксце іх грамадзянскай сутнасці або недастаткова выяўленымі, адназначнымі або супярэчлівымі з пазіцыі гістарычнай праўды. Мастацкая версія, апрача вызначанага вышэй, можа быць вынікам аўтарскай канцэпцыі адлюстравання гістарычных фактаў з наступнай пазіцыі: асоба ў гісторыі – гэта жывы чалавек з яго схільнасцямі, памкненнямі, таемнымі жаданнямі і скрухай з прычыны нечага няздзейсненага.

Да ліку літаратурных твораў, якія можна разглядаць як мастацкую версію гістарычнага факта (факт тут падразумявае элемент зборнасці: сукупнасці фактаў), у беларускай літаратуры можна аднесці, напрыклад, такія, як *След ваўкалака* Леаніда Дайнекі, *Прадыслава* Вольгі Іпатавай, *Пры апазнанні – затрымаць* Васіля Хомчанкі, *Круг* Алеся Пашкевіча, *Гасцініца "Бельгія"* Ганны Севярынец і шэраг іншых. Сярод іх і творы, прысвечаныя постаці Кастуся Каліноўскага, – п'еса Уладзіміра Караткевіча *Кастусь Каліноўскі (Смерць і неўміручасць)*[1] (1963 г., створана да 100-годдзя Паўстання 1863 г.), драматургічная паэма Аркадзя Куляшова *Хамуціус* (1974–1975) і інш.

У час працы над творамі, названымі вышэй, У. Караткевіч і А. Куляшоў звярталіся, апрача іншых крыніц, да матэрыялаў следча-судовай справы К. Каліноўскага[2].

П'еса У. Караткевіча *Кастусь Каліноўскі*, пастаўленая тэатрам імя Якуба Коласа ў 1978 г. (рэжысёр Валеры Мазынскі), упершыню надрукаваная ў часопісе "Полымя" (1980). У жанравых адносінах яна класіфікуецца як трагедыя. Твор мае каля дзесяці варыянтаў, адзін з якіх –

---

[1] Далей выкарыстоўваецца скарочаны варыянт назвы гэтага твора – *Кастусь Каліноўскі*.

[2] Следча-судовая справа К. Каліноўскага аб'ядноўвае чатыры справы: 1) Дело Особой следственной Комиссии о политическом преступнике Викенте Константине Калиновском, 2) Военно-судное дело, произведенное в Комиссии Военного Суда, учрежденной при Виленском Ордонанс Гаузе, над дворянином Викентием Константином Калиновким, сужденным по Полевому Уголовному Уложению за преступное служение революционному Комитету в звании Секретаря Комиссара Литвы, 3) Дело временного полевого аудиториата при штабе войск Виленского военного округа. О дворянине Гродненской губернии и уезда Викентие Калиновском, 4) Дело Штаба войск Виленского военного округа. Судного отделения. Об исполнении конфирмации аб дворянине Викентие Калиновском [*Следча-судовая справа*... 2014: 4–5].

*Руна пра Кастуся* (1963). Як адзначыў аўтар п’есы ў *Заўвагах для акцёраў*, руна – гэта “паданне, песня, а людзі паданняў павінны быць значна цішэйшыя, чым жывыя, больш задушэўныя і стрымана рамантычныя” [Караткевіч 2015, XI: 236]. Старажытныя руны ў мастацкім светаўспрыманні У. Караткевіча ахарактарызаваныя ў аднайменным артыкуле Усевалада Рагойшы [Рагойша 2008: 177–182].

Маючы на ўвазе пададзенае ў пачатку артыкула азначэнне паняцця “мастацкая версія гістарычнага факту”, вызначым ключавыя яго складнікі ў праекцыі на трагедыю У. Караткевіча *Кастусь Каліноўскі*. Да іх ліку адносім наступныя складковыя: 1) час і месца падзей, 2) падзеі і факты, 3) гістарычныя постаці, 4) ідэйная пазіцыя адлюстраваных гістарычных асоб, а таксама дапаможных для іх раскрыцця драматургічных вобразаў. Спалучэнне гэтых складковых на вобразна-выяўленчым і сэнсаўтваральным ўзроўнях уяўляе сабой своеасаблівую рэканструкцыю гістарычных фактаў у форме мастацкай версіі. Сяргей Кавалёў, аналізуючы мастацкую эвалюцыю вобраза Кастуся Каліноўскага на беларускай сцэне, карыстаецца такім паняццем, як “мастацкая інтэрпрэтацыя вобраза Кастуся Каліноўскага” [Кавалёў 2014: 117–123].

Звернемся да вызначэння і характарыстыкі акрэсленых вышэй складковых мастацкай версіі гістарычных фактаў, прапанаванай У. Караткевічам у п’есе *Кастусь Каліноўскі*.

## Час і месца падзей

Паводле заўвагі аўтара, “дзея пачынаецца ў маі 1863 – канчаецца ў сакавіку 1864 года” [Караткевіч 2015, XI: 141].

Рэальныя мастацкі час і прастора п’есы злучаюць у сабе падзеі, што адбыліся ў перыяд ад пачатку паўстання на Беларусі і Літве пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага (паўстанне пачалося ў ноч з 10 (22) на 11 (23) студзеня 1963 г. [Кісялёў 1966: 137]) і да моманту аб’яўлення смяротных прысудаў *дваранціну Канстанціну Каліноўскаму* (9 сакавіка 1864 г.). Першы прысуд (“пакараць смяротнай карай – расстраляннем” [Караткевіч 2015, XI: 227]) аб’яўляе Тызенгаўзен, другі (“замяніць расстрэл – павешаннем” [Караткевіч 2015, XI: 230]) – Мураўёў.

Рэальныя мастацкі час і прастора трагедыі ў яе фінальнай карціне спалучаюцца з містычнымі сцэнамі, якія асобна не вылучаюцца, а раздзяляюцца аўтарскімі рэмаркамі. Першыя дзве з іх праецыруюцца на Кастусёў сон і развітанне з ім Беларусі і ***постацей*** яго паплечнікаў па змаганні – Караліны Яцыны, Юзэфы Яневіч, Чортавага Бацькі, Бронюса Марцявічуса, Арсеня Станкевіча, Вітаўта Парафіяновіча. ***Постаць*** Арсеня абазначае час гэтага развітання – 10 сакавіка. Трэцяя містычная

сцэна таксама адсылае да 10 сакавіка – да фрагментаў зачытвання ***Голасам з цемры*** смяротнага прысуду К. Каліноўскаму перад яго пакараннем і апошняга публічнага сцверджання “вярхоўнага ваяводы Беларусі і Літвы Голасам Кастуся: У нас няма дваран. У нас усе роўныя” [Караткевіч 2015, XI: 234]. ***Голас з цемры***, ***Голас Кастуся*** ў гэтай сцэне перарываюцца галашэннем ***Плакальшчыцы***, каментарамі ***Юрода*** да смяротнага прысуду, рэплікамі-прадказаннямі ***Нямога*** аб працягу барацьбы. Чацвёртая з містычных сцэн – гэта кароткі маналог ***Беларусі***, у якім сцвярджаецца неўміручасць пакараных змагароў. Пятая містычная сцэна – выхад ***Кастуся*** з прасторы крат, якія “бяссільна падымаюцца перад ім” [Караткевіч 2015, XI: 235], і далучэнне да ***Кастуся*** постацей яго паплечнікаў па змаганні.

Падзеі трагедыі *Кастусь Каліноўскі* разгортваюцца ў ваколіцах вёскі Бахарэвічы, Пецярбурзе, Мінску, Вільні. Больш разгорнутыя, дамінавальныя сярод іх – бахарэвічаўскія і віленскія.

## Падзеі і факты

Ахарактарызуем складковыя мастацка-падзейнай бахарэвічаўскай, віленскай, пецярбургскай, мінскай прасторы.

Бахарэвічаўская мастацка-падзейная прастора. Першыя сцэны п’есы адсылаюць да праблемы стварэння атрадаў паўстанцаў для вядзення ўзброенай барацьбы[3]. Тут частка мастацкіх фактаў твора супадае з рэальнымі падзеямі, зафіксаванымі ў сведчаннях сучаснікаў і гісторыкаў.

Так, напрыклад, удзельнік паўстання 1863 г. польскі пісьменнік і гісторык Валеры Пшыбароўскі згадвае наступныя эпізоды агітацыйных вандраванняў К. Каліноўскага).

> Дарэмна Каліноўскі, апрануты ў сярмягу літоўскага селяніна і абуты ў лыкавыя лапці, вандраваў ад вёскі да вёскі, ад карчмы да карчмы і горача

[3] “20 студзеня (1 лютага) ЛПК [Літоўскі правінцыйны камітэт. – А. М.] выпусціў маніфест, у якім абвясціў сябе Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі і салідарызаваўся з праграмнымі дакументамі варшаўскага паўстанцкага ўрада” [гл.: Каліноўскі 1999: 403]. У Маніфесце часовага ўрада Літвы і Беларусі (20.01/1.02.1963 г.) вызначана наступнае: “§ 3. За [зямлю, якую мелі раней, а цяпер атрымалі на вечныя часы ў поўнае ўладанне без чыншаў і выкупаў. – А. М.] сяляне павінны, як шляхта, бараніць польскі край, грамадзянамі якога з’яўляюцца з сённяшняга дня. § 4. Парабкі ж, адстаўныя салдаты і ўсе неаселыя, якія толькі пойдуць бараніць польскі край ад маскалёў, атрымаюць <…> ва ўзнагароду надзел зямлі сама меней у тры моргі” [гл.: Каліноўскі 1999: 95]. Такім чынам, быў агучаны зварот да насельніцтва Беларусі і Літвы з заклікам падняцца на ўзброеную барацьбу. Першыя паўстанцкія атрады ствараліся ў студзені-красавіку 1863 г. у Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віленскай і інш. губернях.

> прапагандаваў ідэі поўнай перадачы зямлі сялянам, тыя яго слухалі пакорліва, але да дзеяння не вельмі спяшаліся [Каліноўскі 1999: 163].
> [Каліноўскі. – *А. М.*] не верыў у паўстанне, распачатае шляхтай, якое ёю кіравалася і здзяйснялася, <...>, таму, не далучаючыся ні да воднай шляхецкай арганізацыі, вытокі якой ішлі з Варшавы, пусціўся пешкі вандраваць па Літве і Русі; начаваў і жыў па сялянскіх халупах, сеяў там зерні рэвалюцыі... [Каліноўскі 1999: 165].

Падобныя факты згадваюцца ва ўспамінах Фелікса Ражанскага – "паплечніка Каліноўскага, які прымаў ўдзел у выданні «Мужыцкай праўды»" [Кісялёў 1966: 21].

У *Сведениях*... Васіля Ратча пададзены наступны факт: К. Каліноўскі

> целый год ходил по деревням и по корчмам, находил, что одно только средство увлечь народ, именно раздать всю поземельную собственность крестьянам и из среды землепашцев составить организацию [Ратч 1867].

Апрача гэтага, факты вандровак К. Каліноўскага ў атрады паўстанцаў на працягу некалькіх месяцаў з мэтай збору змагарных звестак зафіксаваны, напрыклад, у *Паказаннях К. Каліноўскага* ад 30 студзеня 1864 г. [*Следча-судовая справа*... 2014: 26] і *Дакладзе Віленскай Асобай следчай камісіі ад 27 лютага 1864 г*. [*Следча-судовая справа*... 2014: 56].

Згаданыя вышэй факты ўзнаўляюцца ў п'есе падчас першага з'яўлення *Падарожнага* сярод бахарэвічаўскіх сялян (акт першы, карціна першая).

> З'яўляецца падарожны вандроўнік у лапленай сялянскай світцы, з торбай за плячыма, з трохгранным кіем у руках. Бахматая галава, густыя бровы, доўгія вусы. <...>
> Падарожны стаў на пень. Зрывае парык і вусы, адкрываючы вельмі малады твар з гарачымі вачыма. Скідае світку. Пад ёй чамарка, падпяразаная срэбным поясам. За поясам два пісталеты з залатой насечкай, вялізныя, старыя.
> Падарожны. Я – вярхоўны ваявода паўстанцаў Гродзенскай губерні, Кастусь Каліноўскі [Караткевіч 2015, XI: 143, 147].

Факты паўстання, звязаныя з узброенай барацьбой сялянства пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага, узнаўляюцца У. Караткевічам, па-першае, у кантэксце ўзыходжання сялян вёскі Бахарэвічы на шлях узброенай барацьбы і, па-другое, жорсткага іх пакарання царскімі вайскоўцамі за гэтую барацьбу (адпаведна: карціны першая і другая, шостая і восьмая – бахарэвічаўскія сцэны[4]). Падзеі першага акта на ўзроўні мастацкай версіі

[4] У. Караткевіч такія драматургічныя эпізоды ў *Заўвагах да акцёраў* вызначае як "народныя сцэны" [Караткевіч 2015, XI: 236].

адсылаюць да таго перыяду, калі К. Каліноўскі, звяртаючыся да сялян вёскі Бахарэвічы, агучвае свой статус *вярхоўнага ваяводы паўстанцаў Гродзенскай губерні*[5].

Калі іншыя факты і падзеі п’есы (псеўданімы К. Каліноўскага, паказанні Вітаўта Парафіяновіча, Марыі Грэгатовіч, дворніка Шоціка (Шосціка), зносіны з сям’ёй Ямантаў, пражыванне ў Вільні на канспірацыйных кватэрах і інш.) маюць дакументальнае пацвярджэнне, прынамсі, у следча-судовай справе К. Каліноўскага, з якой быў знаёмы У. Караткевіч, то падзеі, звязаныя з сустрэчай кіраўніка паўстання на Гродзеншчыне з сялянамі вёскі Бахарэвічы (карціна першая), *бітва* бахарэвічаўскіх сялян з салдатамі атрада палкоўніка Цапліна (карціна другая) – гэта мастацкая версія (так магло быць) аднаго са шляхоў прыцягнення сялян да ўзброенай барацьбы і яе арганізацыі ў праекцыі на сялянскую падтрымку. Пры гэтым адзначым, што ў аўтарскіх рэмарках нідзе не адзначаецца, што вылучаныя вышэй падзеі адбываюцца менавіта зімой. Аднак гіпатэтычна можам іх праецыраваць менавіта на гэты перыяд 1863 г., улічыўшы, што ў канцы студзеня – пачатку лютага 1863 г. ён атрымаў “мандат на пасаду ўрадавага камісара Гродзенскага ваяводства” [Герасімчык 2018: 175].

Другая з масавых сцэн п’есы адбываецца, як адзначана ў рэмарцы, “у апошнія дні жніўня”. Гэты прамежак мастацкага часу суадносіцца з 1863 г.[6]. Дадзеныя падзеі (карціна шостая) рэпрэзентуюцца як сцэны народнага суда і пакарання пасля абвінавачвання гэтым сялянскім судом пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага “палкоўніка царскай арміі Цапліна ў незлічоных ліхадзействах, якія ён чыніў тут і на магілёўскай зямлі, як супраць мірнага народа, так і супраць людзей, якія законна паўсталі за сваю волю, веру, бацькаўшчыну” [Караткевіч 2015, XI: 183].

З падзеямі ў лёсе бахарэвічаўскіх паўстанцаў звязаны самы трагічны факт масавых сцэн п’есы (карціна восьмая). Атрад капітана фон Юнгена спальвае вёску Бахарэвічы (па-за сцэнічнае дзеянне): “Калі заслона паднялася – мы бачым <…> далёка! – вёску ў агні. Гараць Бахарэвічы” [Караткевіч 2015, XI: 193].

---

5 К. Каліноўскі выязджае ў Гродна, атрымаўшы “мандат на пасаду ўрадавага камісара Гродзенскага ваяводства: канец студзеня – пачатак лютага 1963 г.” [Герасімчык 2018: 175].

6 “У чэрвені 1863 года ў сувязі з пераездам К. Каліноўскага ў Вільню яго месца заняў Заблоцкі. Ваяводскім жа чатырох паветаў – Гродзенскага, Сакольскага, Ваўкавыскага і Слонімскага – стаў Сільвястровіч. Пакідаючы Гродзенскую ваяводскую арганізацыю, Каліноўскі лічыў, што пакідае яе ў руках адказнага паплечніка – Эразма Заблоцкага, які прыкладзе ўсе намаганні для падтрымання яе дзейнасці. Менавіта так і сталася” [Герасімчык 2018: 188–189].

Асуджаюцца на высылку мужыкі спаленай вёскі. У гэтай сцэне капітан прапаноўвае Вастравуху назваць кіраўніка паўстання – за гэта будуць адпушчаны арыштаваныя сяляне. Вастравух адпрэчвае такую прапанову наступнымі словамі: “А кіравала / Усімі намі ярасць. Вось і ўсё” [Караткевіч 2015, XI: 195]. У выніку ў лішняй ад дваццаці сямі вырытых (для 80 забітых паўстанцаў і 128 салдат) магіле салдаты закопваюць жывымі паўстанцаў: пана Зарубу, Вастравуха і Яўхіма Барданоса.

Вылучаныя вышэй бахарэвічаўскія сцэны ўяўляюць сабой мастацкую версію наступных гістарычных фактаў у гісторыі паўстання на Беларусі: па-першае, імкненне яго кіраўніка абапірацца ў барацьбе на сялянства, па-другое, жорсткія пакаранні ўдзельнікаў паўстання, у тым ліку і сялян.

Віленская мастацка-падзейная прастора. У Вільню К. Каліноўскі перыядычна наведваўся ў час паўстання[7]. Як вядома, апошні год свайго жыцця К. Каліноўскі заставаўся ў Вільні, не зважаючы на парады паплечнікаў па барацьбе пакінуць горад і падацца на эміграцыю.

Цэнтральнымі фактамі віленскіх сцэн п’есы з’яўляюцца наступныя:

1. Прыход на канспірацыйную кватэру Юзэфы Яневіч Вітаўта Парафіяновіча[8] з дакладам К. Каліноўскаму аб разгроме на Магілёўшчыне: там паўстання больш не існуе, арміі няма. Марцявічус, які завітаў разам з Парафіяновічам, абвінавачвае апошняга ў тым, што той як кіраўнік вайсковага паўстанцкага згуртавання, што ішло на ўз’яднанне з атрадамі Загорскага і Грыневіча, “пагубіў людзей, <…> сам аддаў край ворагу” [Караткевіч 2015, XI: 163]. Галоўная стратэгічная памылка і віна Парафіяновіча, вызначаныя ў час гэтай гутаркі-спрэчкі, – яго няверʼе ў магчымасць апоры на мужыкоў у змаганні. Ацэнка К. Каліноўскім

---

[7] Як адзначае В. Герасімчык, “услед за Гроднам Каліноўскі аднаўляе паўстанцкую дзейнасць у Вільні, дзе арганізацыя на чале з Я. Гейштарам пасля серыі арыштаў фактычна перастала існаваць. <…> 22 жніўня быў арыштаваны Оскар Авейдэ, які да гэтага паспеў дамовіцца, пайшоўшы на саступкі, з Літоўскім камітэтам і перадаў свае паўнамоцтвы камісара ў Літве і Беларусі Каліноўскаму. У выніку той зрабіўся фактычным дыктатарам паўстання, сканцэнтраваўшы ў сваіх руках паўнату ўлады. <…> Апошні год свайго жыцця Каліноўскі жыў у Вільні пад рознымі прозвішчамі, сярод якіх былі Хамовіч, Макарэвіч, затым Ігнацій Вітажэнец. Для кожнага з іх ён рыхтаваў пэўную легенду. <…> Яшчэ ў верасні 1863 года з Варшавы яму, Каліноўскаму, Даманскі прывёз намінацыю на званне паўнамоцнага камісара Літвы, тым самым Варшава пасля пагроз адасаблення Вільні зацвердзіла прапанаваныя ёй умовы” [Герасімчык 2018: 189, 193, 196].

[8] Факт знаёмства Парафіяновіча (Парфіяновіча) з Каліноўскім зафіксаваны ў Следча-судовай справе Кастуся Каліноўскага (паказанні Парфіяновіча, Каліноўскага); пра гэта – ніжэй.

такога праліку і недальнабачнасці Парафіяновіча была катэгарычнай: "Гэта страшна. Але яшчэ страшней, што не верыў... Будзеш плаціць, Вітаўт... Жыццём..." [Караткевіч 2015, XI: 164].

2. Намеры К. Каліноўскага і паплечнікаў выкрасці палкоўніка Цапліна ў час яго вяртання з тэатру. Мэта гэтага плана – пакаранне палкоўніка за здзейсненыя злачынствы (яшчэ раней пасля бітвы пад Бахарэвічамі Цаплін уцёк ад паўстанцаў, пераапрануўшыся ў *салдацкую кашулю*). Аднак план паланення палкоўніка не рэліазаваны, бо з тэатра той вяртаецца разам з М. Мураўёвым і дэ Салье (акт першы, карціна чацвёртая).

3. Баль у Мураўёўскім палацы, на які прайшлі і прысутнічаюць як госці К. Каліноўскі (паводле канспірацыйнай легенды для балю – князь Мсціслаўскі), яго сябра Арсень Станевіч, Караліна Яцына (княжна Надзея Загорская – стрыечная сястра князя Мсціслаўскага), Марцявічус; мэта прысутнасці тут К. Каліноўскага і яго паплечнікаў – выкрасці палкоўніка Цапліна. У гэтай жа карціне адбываецца непасрэднае знаёмства К. Каліноўскага з віленскім генерал-губернатарам графам М. Мураўёвым – *Рыцарам пяньковай вяроўкі* – і гутарка з ім (карціна пятая).

4. Падзеі на канспірацыйнай кватэры *за модным магазінам, што належыць Юзэфе Яневіч*. Сюды Вітаўт Парафіяновіч прыводзіць Марыю Грэгатовіч, якая паведамляе пра пошукі ўладамі *слядоў Макарэвіча*, за прозвішчам якога хаваецца К. Каліноўскі[9]. Марыя ў час гэтай сустрэчы прызнаецца ў каханні да Кастуся, а таксама ў нянавісці да яго справы, якая *адбірае* яго ў яе. У гэты ж час Вітаўт і Марыя становяцца сведкамі надання К. Каліноўскаму новага падпольнага прозвішча – Вітажэнец. Падзеі гэтай сцэны звязаны таксама з імкненнем Парафіяновіча да ўдзелу ў *вялікай справе*. К. Каліноўскі накіроўвае Парафіяновіча, які *марыць аб славе*, на Міншчыну дзеля навядзення там на працягу месяца *стальнога парадку*. Паказальны факт гэтай – дзявятай – карціны п'есы

---

[9] 24 – 25 снежня. Пасланая К. Каліноўскім у Коўна з пісьмом Стэфанія Фальская расказвае ў ковенскай следчай каміііі (у прысутнасці палкоўніка Шалгунова, які прыбыў з Вільні), што ведала К. Каліноўскага пад прозвішчам Макарэвіча і што ён часта наведваў сям'ю Грагатовічаў [Кісялёў 1966: 173–174, 175]. Факт знаёмства К. Каліноўскага з сям'ёй Юзэфы Грагатовіч зафіксаваны ў яго паказаннях Віленскай Асобай следчай камісіі ад 30 студзеня 1864 г., дзе адзначана, што ён "поселился в семье Григотович, которых до сего времени не знал. <...> У Греготович жил под фамилиею Калиновского около 1,5 месяца в конце 1862 и начале 1863 года, в то время, как там квартировала девица Стефания Фальская и Бронислава Сидоровичь, дочери же Григотович, Марии, тогда не было" [*Следча-судовая справа*... 2014: 25, 29]. Марыя Грагатовіч у паказаннях ад 29 студзеня 1864 г. засведчыла, што Вітажэнец "есть тот самый господин, которого я видела приходившего к жившей в нашей квартире девице Стефании Фальской, и который тогда назывался Макаревичем" [*Следча-судовая справа*... 2014: 23].

ў тым, што К. Каліноўскі папракае Парафіяновіча ў яго неасцярожнасці: *на канспіратыўную кватэру нельга весці старонніх* (маецца на ўвазе Марыя Грагатовіч – карціна дзявятая). На самай жа справе *старонні*м у адносінах да канспірацыйнай кватэры, толькі не гэтай, аказаўся менавіта Парафіяновіч, якому паказаў Каліноўскі-Вітажэнец свой апошні канспірацыйны прытулак на *Свентаянскіх мурах* (так называецца гэтае месца ў творы). Гэты факт[10] застаўся па-за драматургічнымі часам і прасторай дадзенага твора. Падмацаванне выказанай вышэй выснове пра веданне Парафіяновічам факту пражывання К. Каліноўскага ў *Свентаянскіх мурах* знаходзім у наступнай – дзясятай – карціне п’есы.

5. Яшчэ адзін эпізод віленскага жыцця К. Каліноўскага – яго сустрэча *ў абсерваторыі*, што на *Свентаянскіх мурах*, з паплечнікамі-паўстанцамі (акт трэці, карціна адзінаццатая): Чортавым бацькам і Марцявічусам, а таксама яго каханай Каралінай Ямант. Апошняя прапаноўвае Кастусю падацца на эміграцыю разам з іншымі (ужо *падрыхтаваны трыццаць два пашпарты для ўцекачоў* у Лібаву). Аднак такое выйсце для самазахавання той адпрэчвае. У гэтай жа карціне ўпершыню Караліна і Кастусь прызнаюцца адзін аднаму ў каханні. Кастусь прымае прапанову Караліны і Юзэфы Яневіч пераехаць са *Свентаянскіх муроў*, дзе заставацца небяспечна (*каля губернатарскага палаца некалькі рот пад ружжом*), у іншае месца – знойдзена кватэра *на Георгіеўскім*. Аднак К. Каліноўскі не дачакаўся пераезду на новую кватэру. Пасля развітання з Каралінай – уначы – яго арыштоўваюць (карціна адзінаццатая).

Факт знаёмства і рэвалюцыйнага супрацоўніцтва Кастуся і Караліны зафіксаваны, напрыклад, ва ўспамінах Людвікі Радзевіч (Ямант), *сястры Язэпа і Марыі Ямантаў, мемуарысткі, якая за дачыненне да паўстання 1863 г. была выслана ў Разанскую губерню*[11].

---

[10] Параўнаем: “25 снежня. У Вільню прыязджае В. Парафіяновіч і знаходзіць Каліноўскага ў Ямантаў. Каліноўскі вядзе яго на сваю кватэру ў Святаянскія муры і паведамляе, што жыве пад імем Ігнацыя Вітажэнца” [Кісялёў 1966: 176]. Гэты факт зафіксаваны ў Паказаннях К. Каліноўскага… ад 6 лютага 1864 г.: <…> “второй раз он [Парафіяновіч. – А. М.] здесь был в Вільне около Нового года, и с ним встретился на улице. Не зная где живет Шадурский чтобы его отправил в экспедицию и не имея в виду никакой квартиры знакомой, я пригласил его к себе с тем чтобы он для разговора явился в завтрашний день, когда будет Шадурский” [*Следча-судовая справа*… 2014: 42].

[11] “<…> Адначасова быў арыштаваны і Канстанцін Каліноўскі, які пад прозвішчам Вітажэнца жыў у былых універсітэцкіх будынках <…>. Яго кватэру, дзеля перасцярогі, наведвала абмежаванае кола людзей, паколькі асоба яго – важная для справы – аберагалася. Дзеля сувязі з ім, дастаўкі яму і адсылкі яго карэспандэнцыі вылучана была цудоўная дзяўчына – Караліна Яцына <…> У Канстанціна

Эпізод арышту К. Каліноўскага супадае з фактамі, зафіксаванымі ў гістарычных дакументах, а таксама ў сведчаннях сучаснікаў (напрыклад, у запісах Аляксандра Масалова – *чыноўніка канцылярыі Мураўёва*[12], успамінаў Аляксандра Нікоціна – *кіраўніка асобай канцылярыі генерал-губернатара (1864–1865), які знаходзіўся пры Мураўёве для складання справаздачы цару і запісак*[13]).

6. Пасяджэнне ў Вільні следчай камісіі па справе К. Каліноўскага – гэта перадапошняя карціна п'есы. Марыя Грэгатовіч тут выступае як здрадніца. Яе апазнанне Макарэвіча-Каліноўскага выклікана немагчымасцю прыняць ужо відавочны факт кахання паміж Кастусём і Каралінай. У гэтай жа карціне К. Каліноўскі адпрэчвае ўскосную прапанову палкоўніка Шалгунова адносна паведамлення дадзеных пра ўдзельнікаў і кіраўнікоў паўстання (карціна дванаццатая) Гэты факт зафіксаваны ў *Дакладзе Віленскай Асобай следчай камісіі...* ад 27 лютага 1864 г[14]. Факт клопату К. Каліноўскага пра паплечнікаў па змаганні ў час яго допытаў ускосна пацвярджаецца ў пратаколах яго допытаў. Так, напрыклад, ён спачатку адмаўляе факт знаёмства з Марыяй Грэгатовіч у час пражывання

Каліноўскага [жандары. – А. М.] спадзяваліся знайсці важныя дакументы, якія, дарэчы, захоўваліся ў полай ножцы яго стала; аднак у момант вобыску яе не знайшлі, відаць, пра яе не ведалі, а калі назаўтра жандары прыйшлі зноў, яна ўжо была пустая. З вялікай небяспекай для сябе Яцына іх апярэдзіла" [Каліноўскі 1999: 204, 438].

[12] З запісаў А. Масалова: "Полицмейстеру было поручено лично справиться в книгах <...> о точном адресе Витоженца, и, как всегда бывает при поспешности, имя его ускользнуло при рассмотрении книг, хотя и было в них внесено. Пришлось снова сделать огромный обыск и оцепить весь Св.-Янский квартал, для чего понадобилось две роты солдат, разделенные на 10 партий, при офицерах полиции и особых чиновниках. Имя лица, которое следовало арестовать, было им объявлено лишь ночью перед самым обыском. Калиновский нанимал уже другой месяц комнату в квартире одного учителя гимназии, уехавшего куда-то в отпуск. Его застали на площадке лестницы со свечою в руке, и когда, спросили фамилию, он самоуверенно отвечал: «Витоженец» – и в ту же минуту был задержан" [Каліноўскі 1999: 206–207, 431].

[13] "Весь квартал был оцеплен около полуночи с приказанием никого не выпускать из ворот, и затем начались обыски в разных квартирах. <...> посчастливилось вскоре захватить и скрывавшегося коновода мятежа. Он, как оказалось, проживал в правом флигеле, внизу. Когда прибывшие для обыска лица постучали в дверь, ее отворил какой-то молодой человек, со свечою в руках. На вопрос полицейского офицера, кто он таков, последовал ответ: – Витольд Витоженец..." [Каліноўскі 1999: 208, 434].

[14] "Комиссия неоднократно вызывала его [Каліноўскага. – А. М.] к показанию истины. На это обращение Калиновский положительно отозвался, что назвать соучастников своих не решается, считая поступок такой шпионством и противным своим убеждениям" [*Следча-судовая справа*... 2014: 2014: 63].

на кватэры яе маці (30 студзеня 1864 г.[15]), а таксама з сям'ёй Ямантаў (4 або 5 лютага 1864 г.[16]).

У дванаццатай карціне твора выступае таксама член следчай камісіі паручнік Гогель. Усе з гэтых дзейных асоб мастацкай прасторы твора маюць сваіх прататыпаў у рэальным гістарычным часе.

7. Апошняя віленская карціна п'есы ў першай яе частцы адбываецца ў камеры ў Дамініканах, дзе палкоўнік Тызенгаўзен агучвае К. Каліноўскаму пра яго пакаранне праз расстрэл. Тут жа адбываецца другая сустрэча *вярхоўнага ваяводы Беларусі і Літвы* з Мураўёвым. *Граф-вешальнік* спрабуе схіліць К. Каліноўскага да супрацоўніцтва (абяцае *волю і месца* пры ім), выказваючы сваю павагу да кіраўніка паўстання. Аднак апошні адхіляе і гэтую прапанову (першая прапанова аб супрацоўніцтве са следствам была агучана палкоўнікам Шалгуновым у папярэдняй карціне). Другая частка гэтай карціны вызначаецца містычнай формай і зместам. У сне К. Каліноўскага да яго прыходзяць дарагія яго сэрцу постаці. Іх выказванні гучаць не толькі як развітанні з Кастусём – сынам сваёй Айчыны (Беларусь), каханым (Караліна), паплечнікам, што прынёс святло ў жыццё (Чортаў Бацька, Марцявічус), змагаром, чыя змагарная справа нарадзіла ў сялянскіх сэрцах любоў да яго (Арсень), пераможцам з яго вызваленчай ідэяй саюзу з *мужыком* (Вітаўт). У словах гэтых герояў сцвярджаецца факт неўміручасці К. Каліноўскага і яго справы, асабліва прароча ён гучыць у Голасе Беларусі (акт трэці, карціна трынаццатая).

П е ц я р б у р г с к а я  м а с т а ц к а - п а д з е й н а я  п р а с т о р а. Яна прадстаўлена адзінай – сёмай – карцінай. Тут восенню 1963 г. у царскім кабінеце адбываецца гутарка паміж Аляксандрам, графам Мураўёвым і жандарскім палкоўнікам Лосевым. Яны абмяркоўваюць праблему спынення *мужыцкага паўстання* праз шматлікія пакаранні (цар выступае супраць агучвання *ва ўсіх газетах* вынікаў карных акцый) і арышт К. Каліноўскага, які *паставіў пад ружжо сто тысяч мяцежнікаў*. Апошняга Мураўёў характарызуе, як *асобу нечалавечай нянавісці* да цара і *таленавітага арганізатара, ваяводу, публіцыста*, які *любіць сваю ідэю*.

М і н с к а я  м а с т а ц к а - п а д з е й н а я  п р а с т о р а. Яна таксама рэпрэзентуецца толькі адной – дзясятай – карцінай. Тут прапаноўваецца мастацкая версія допыту Лосевым арыштаванага *камісара Магілёўскай*

---

[15] Паказанні К. Каліноўскага Віленскай асобай следчай камісіі [*Следча-судовая справа*... 2014: 25].

[16] Паказанні К. Каліноўскага Віленскай асобай следчай камісіі з дадатковымі звесткамі... [*Следча-судовая справа*... 2014: 40].

*губерні* Парафіяновіча ў *канцылярыі мінскай жандармерыі*. Жандарскі палкоўнік паказваецца тут як дасведчаны псіхолаг, які ўмела здолеў націснуць на патрэбныя клавішы ў псіхіцы Парафіяновіча з мэтай атрымання ад яго неабходнай інфармацыі. Апошні называе падпольныя прозвішчы К. Каліноўскага і выдае яго месцазнаходжанне ў Вільні.

Супастаўленне прыведзеных вышэй мастацкіх складковых трагедыі У. Караткевіча *Кастусь Каліноўскі* з гістарычнымі падзеямі дазваляе зрабіць выснову пра дамінаванне ў падзейнай плоскасці твора прыкмет мастацкай версіі эпізодаў змагання К. Каліноўскага і яго паплечнікаў. Да гістарычных фактаў, адлюстраваных у п'есе, адносім наступныя. Агульныя факты: саюз К. Каліноўскага і сялянства ў паўстанні; супрацьстаянне *белых* і *чырвоных*; агітацыйная праца сярод сялянства; вядучая роля К. Каліноўскага ў паўстанні на Беларусі і Літве; Вільня як апошні змагарны і жыццёвы прытулак кіраўніка паўстання; змаганне з паўстанцамі з боку царскай сістэмы як спланаваная жорсткая карная акцыя. Прыватныя факты[17]: карыстанне К. Каліноўскім дзеля канспірацыі прозвішчамі Макарэвіч і Вітажэнец; пражыванне К. Каліноўскага ў Вільні ў два апошнія месяцы яго жыцця; апошні канспірацыйны прытулак кіраўніка паўстання ў *Свентаянскіх мурах*; здрада Парафіяновіча; вядзенне следства па справе К. Каліноўскага палкоўнікам Лосевым; апазнанне К. Каліноўскага Марыяй Грэгатовіч; паказанні дворніка Ігнася Шосціка (Шоціка) у час следства; допыты К. Каліноўскага; замена смяротнага пакарання праз расстрэл на павешанне. Гэтыя і іншыя гістарычныя факты рэканструююцца ў п'есе паводле прынцыпу "так магло быць" (толькі некаторыя з іх маюць гістарычнае пацвярджэнне на ўзроўні падзейнасці і яе паслядоўнасці: здрадніцкія паказанні Парафіяновіча, арышт К. Каліноўскага, паказанні дворніка; апазнавальнае сведчанне Марыі Грагатовіч, некаторыя факты допытаў К. Каліноўскага, смяротны прысуд *вярхоўнаму ваяводу Беларусі і Літвы*).

## Гістарычныя постаці

Дзейныя асобы трагедыі *Кастусь Каліноўскі* прадстаўлены чатырма групамі: *Сейбіты*, *Аратыя*, *Крумкачы*, *Іншыя*. У першай і трэцяй з гэтых груп пададзены героі, якія маюць рэальныя гістарычныя прататыпы. Сярод іх наступныя: *Сейбіты* – К. Каліноўскі, Арсень Станевіч[18],

[17] Тут і далей прозвішчы падаюцца так, як яны прадстаўлены ў творы.

[18] Гэтая дзейная асоба (сябра Кастуся, прысутнічае ў многіх сцэнах п'есы) у некаторай ступені адпавядае постаці Казіміра Станкевіча. Паводле фактаў, якія прыводзіць Г. Кісялёў, "батрак Казімір Станкевіч праводзіў рэвалюцыйную прапаганду сярод сялян ужо вясной 1862 г. Пазней ён стаў актыўным распаўсюджвальнікам «Мужыцкай праўды»" [Кісялёў 1966: 24].

Караліна Яцына[19], Вастравух (прататып – Фелікс Віславух[20]), Юзэфа Яневіч (прататып – Юзэфа Баневіч[21]); *Аратыя* – Ігнась Шосцік (Шосцік)[22]; *Крумкачы* – граф Міхаіл Мураўёў, імператар Аляксандр II, жандарскі палкоўнік Лосеў[23], паручнік Гогель[24]; *Іншыя* – Вітаўт Парафіяновіч[25], Марыя Грэгатовіч[26], палкоўнік Шалгуноў[27], палкоўнік барон Тызенгаўзен[28].

---

[19] "Яцына Караліна (каля 1837 – ?), хатняя настаўніца ў Вільні, у 1863 г. удзельнічала ў паўстанцкай арганізацыі, выконвала даручэнні Каліноўскага; арыштавана 29.1.1864, саслана ў Сібір" [Каліноўскі 1999: 452].

[20] "Віславух Фелікс (каля 1833 – пасля 1869), студэнт Маскоўскага і Кіеўскага ўніверсітэтаў; слухач польскай ваеннай школы ў Італіі; у 1863 г. камандзір паўстанцкага атрада ў Віленскай губ.; дэмакрат, прыхільнік «чырвоных»" [Каліноўскі 1999: 452]. Згадваецца у такіх дакументах па справе К. Каліноўскага, як: Акт Віленскай Асобай следчай камісіі… ад 29 студзеня 1864 г.: "Игнатий Витоженец долгое время упорствовал в открытии настоящего своего имени и занятий, утверждая, что он <…> до октября месяца находился в шайке Вислоуха, после чего возвратился в Вильно, где нанял квартиру в гимназии" [*Следча-судовая справа*… 2014: 21]; Даклад Віленскай Асобай следчай камісіі… ад 27 лютага 1864 г.: фактычна дублюе прыведзены вышэй факт пра знаходжанне Каліноўскага ў шайцы Віславуха [*Следча-судовая справа*… 2014: 55].

[21] У. Караткевіч адзначаў, што некаторым з герояў паўстання ён змяніў прозвішчы: "скажам Юзэфа Яневіч – Юзэфа Баневіч, – мне не падыходзіў яе ўзрост, трэба было прыбавіць некалькі год" [Караткевіч 2015, XI: 236]. "Баневіч Юзэфа (каля 1834 – ?), родам з Ашмянскага пав., жонка віленскага чыноўніка; за ўдзел у патрыятычных дэманстрацыях і сувязі з Каліноўскім 28.1.1864 арыштавана і саслана ў Арэнбургскую губ." [Каліноўскі 1999: 409].

[22] "Игнатий Шоцик, казенный крестьянин Виленского уезда <…>, прислуживал" Каліноўскаму (Вітажэнцу) у час яго пражывання ў гімназічным будынку. Даваў паказанні Віленскай Асобай следчай камісіі пра абставіны пражывання К. Каліноўскага ў Святаянскіх мурах [*Следча-судовая справа*… 2014: 35–36].

[23] "Лосеў Аляксандр Міхайлавіч (1819–1885), палкоўнік, віленскі губернскі жандарскі штабс-афіцэр, з 1864 г. старшыня Асобай следчай камісіі ў Вільні" [Каліноўскі 1999: 429].

[24] "Гогель Мікалай Валяр'янавіч (1838–1870), артылерыйскі паручнік, член Асобай следчай камісіі ў Вільні" [Каліноўскі 1999: 415)].

[25] "Парфіяновіч (Парафіяновіч) Вітальд (1844 – ?), студэнт Кіеўскага ўніверсітэта; у 1864 г. паўстанцкі камісар Магілёўскага ваяводства; у студзені арыштаваны, выдаў адрас і псеўданім Каліноўскага, даў падрабязныя паказанні" па справе Каліноўскага [Каліноўскі 1999: 435].

[26] "Грагатовіч (Грыгатовіч) Марыя, дваранка <…>, хатняя настаўніца; 11.12.1863 г. арыштавана" [Каліноўскі 1999: 435]. Як сведчаць дакументы ССС (Акт Віленскай асобай следчай камісіі… 29.01.1864; Паказанні Марыі Грагатовіч… ад 29.01.1864), Марыя Грагатовіч апазнала на вочнай стаўцы Каліноўскага [*Следча-судовая справа*… 2014: 23].

[27] "Шалгуноў Павел Міканоравіч, палкоўнік <…>, старшыня Асобай следчай камісіі ў Вільні" [Каліноўскі 1999: 448].

[28] 04.03.1864 разам з генерал-лейтэнантам Фаміным, палкоўнікам Леантовічам і інш. падпісаў Заключэнне Часовага аўдытарыята па справе К. Каліноўскага паводле

Мастацкае раскрыццё вобразаў гэтых герояў У. Караткевіч здзяйсняе ў адпаведнасці з аўтарскай канцэпцыяй адлюстравання характару гістарычнай асобы і яе ролі, уплыву на адпаведныя гістарычныя падзеі. Некаторыя са складнікаў такой канцэпцыі ў праекцыі на трагедыю *Кастусь Каліноўскі* знаходзім у аўтарскіх *Заўвагах для акцёраў* – выканаўцаў роляў у спектаклі па дадзенай трагедыі. Пры гэтым У. Караткевіч браў пад увагу жанравыя асаблівасці аднаго з пачатковых варыянтаў твора: асаблівасці руны. У *Заўвагах да акцёраў* У. Караткевіч адзначыў наступнае:

> у характарах – галоўнае, а зусім не ў тым, урэшце <...>, што Беларусь і Літва паўсталі, а потым іх скарылі, што Мураўёў быў вешацель і спавядаў фаталізм, а Каліноўскі быў харошы і навучыўся дэмакратызму, чытаючы артыкулы Чарнышэўскага. Людзі, вось што галоўнае. Розныя: дрэнныя, добрыя або проста цёпленькія, дурныя і разумныя, людзі, скутыя адным ланцугом [Караткевіч 2015, XI: 237].

Даючы парады акцёрам адносна выканання пэўных роляў, У. Караткевіч звяртае ўвагу на тое, *чаго нельга рабіць ні ў якім разе, бо гэта не адпавядае характару, задуманаму аўтарам* [Караткевіч 2015, XI: 238]. Канстатуем далей некаторыя факты *задуманага аўтарам* у адносінах да яго герояў. Гэта дазволіць зразумець асаблівасці мастацкай рэканструкцыі падзей і – галоўнае – адметнасць гістарычных постацяў, увасобленых у некаторых драматургічных героях гэтага твора.

> *Каліноўскі* <...> у нас не трактат, а руна, таму нам важна *ўяўленне* аб ім. <...> ён ваявода, герой, талент, але ніяк не правадыр, не манумент. Проста чалавек, страсны, гарачы, нястрыманы чалавек <...>. Ён чалавек жывы і разнастайны... [Караткевіч 2015, XI: 238.

У п’есе К. Каліноўскі выступае як *вярхоўны ваявода паўстанцаў Гродзенскай губерні*, прадстаўнік *чырвонага ўраду* (карціна першая), *вярхоўны ваявода Беларусі і Літвы* (карціна трынаццатая). К. Каліноўскі – *асоба нечалавечай нянавісці да цара* (карціна сёмая); ён аддае ўсяго сябе справе паўстання: *мы ўсе тут – жаніхі радзімы, свабоды* (карціна восьмая) і не даруе ворагу страты змагароў: “На кожнага павешанага паўстанца падпольны ўрад адкажа ўдарам кінжала” [Караткевіч 2015, XI: 201].

К. Каліноўскі выступае як рашучы і адчайны змагар, які гатовы ісці да канца ў справе паўстання: “Усім нам іншай дарогі няма: або перамога, або пятля...” [Караткевіч 2015, XI: 206]; “Жывём, як на вастрыю маланкі.

---

якога зафіксавана наступнае рашэнне ў адносінах да “главного распорядителя по восстанию в крае: казнить смертию повешением” [*Следча-судовая справа*... 2014: 91–96].

Вось блісне аб скалу… <…> Што я? Я і жыву толькі таму, што для іншых” [Караткевіч 2015, XI: 216]. Ён не прымае прапанову Караліны Яцыны аб эміграцыі[29], агучваючы прычыны такога адмаўлення: “*Вільня* – сэрца. Мне нельга ад яго. <…> Я вазьму [адзін з падрыхтаваных трыццаці двух пашпартоў для эмігрантаў. – *А. М.*], а ў другога не будзе” [Караткевіч 2015, XI: 215]). У фінале твора У. Караткевіч словамі Кастуся сцвярджае яго любоў да Беларусі: “Вялікі мой народ, зямля мая. // <…> Я толькі што памёр. І ў гэты час // Аддаў табе, зямля, сябе самога, // Каб ведала, як я цябе люблю” [Караткевіч 2015, XI: 235].

Прыведзеныя вышэй факты п’есы супадаюць з гістарычнымі сведчаннямі, што маюцца ў судова-следчай справе К. Каліноўскага, а таксама яго сучаснікаў.

У судова-следчай справе К. Каліноўскага неаднаразова згадваецца яго паўстанцкія статусы (*званне*, *пасада*, *роля*): "главный распорядитель в крае, Комиссар Гродненской Губернии” – з *Паказанняў К. Каліноўскага Віленскай Асобай следчай камісіі* ад 30 студзеня 1864 г. [*Следча-судовая справа*… 2014: 26, 27, 30], “Комиссар Гродненского воеводства” – з *Даклада Віленскай Асобай следчай камісіі…* [*Следча-судовая справа*… 2014: 54] і інш.

Трыццатага студзеня 1864 г. К. Каліноўскі даў наступнае прызнанне Віленскай Асобай следчай камісіі: “В это время вспыхнуло восстание. <…> Как здешний уроженец я решился посвятить себя народному делу” [*Следча-судовая справа*… 2014: 25). У *Дакладзе Віленскай Асобай следчай камісіі…* ад 27 лютага 1864 г. адзначалася наступнае: “При самом начале раскрытия действий революционной организации в Вильне показаниями исполнявших преступные должности <…> обнаружилось, что одним из самых преданных делу восстания и наиболее деятельных его руководителей в здешнем крае был <…> Константин Калиновский” [*Следча-судовая справа*… 2014: 54]. Прыведзеныя факты згадваюцца таксама ў шэрагу іншых дакументаў следча-судовай справы К. Каліноўскага.

Пра самаадданасць К. Каліноўскага згадваюць і яго сучаснікі.

Так, старшыня Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы Якуб Гейштар ва ўспамінах пра К. Каліноўскага побач са значнымі негатыўнымі

[29] Параўнаем гэты факт са сведчаннем, якое маецца ва ўспамінах Я. Гейштара. “Ад 1 жніўня 1863 года да арышту ў студзені 1864-га Каліноўскі быў жывым духам крывавай літоўскай дэманстрацыі, яе дагарання. Ён мог уцякаць з Вільні, але ніколі не дапускаў думкі пра гэта, бо лічыў сваім абавязкам як быў першым змоўшчыкам на Літве, так стаць апошняй ахвярай тэрору Мураўёва” [Каліноўскі 1999: 158].

якасцямі *дыктатара Літвы* канстатаваў наступныя праявы яго характару ў адносінах да змагарнай дзейнасці.

> Гэта была натура гарачлівая, але сумленная, без малейшай крывадушнасці. Аддадзены душой і сэрцам люду і бацькаўшчыне <...>. Гэты чалавек адзін быў варты сотняў, бо ўмеў працаваць, ахвяраваць сабою <...> Каліноўскі быў выдатным, а ў нас, можа, адзіным камісарам, чалавекам вялікай ахвярнасці [Каліноўскі 1999: 158, 154, 156].

Скіраванасць К. Каліноўскага на рашучую помсту праціўнікам і ворагам адзначаецца ў сведчаннях В. Пшыбароўскага[30], які згадваў такі факт: "Са сваімі дэмакратычнымі памкненнямі, ён не хацеў ніякай шляхецкай арганізацыі, наадварот, выказваўся, што «сякера не павінна спыняцца нават над калыскай шляхецкага нямоўлі»" [Каліноўскі 1999: 163].

У *Известиях о польском мятеже*... рускага гісторыка В. Ратча[31] зафіксаваны наступны факт.

> Далеко деятельнее, энергичнее и способнее всех воеводских комиссаров для революционного дела оказался Калиновский. Суровый гродненский комиссар не деликатничал и не церемонился. Не останавливаясь ни перед какою мерою, он издавал самые решительные приказания по воеводству и зорко следил за исполнением делаемых распоряжений и за деятельностью панов, членов организации [Каліноўскі 1999: 178–179]
> Константин Калиновский <...>, младший в многочисленном виленском комитете заговорщиков, непреклонно настаивал на принятие его мнений и превзошел всех членов требовательностию своих предначертаний [Ратч 1867].

У дзявятай карціне п'есы прадстаўлена сцэна накіравання К. Каліноўскім Парафіяновіча (разгубленага, які жадае рэабілітацыі пасля разгрому паўстання на Магілёўшчыне[32], а таксама славы ў *вялікай*

---

[30] "Пшыбароўскі Валеры (1845 – 1913), удзельнік паўстання 1863 г. <...> аўтар грунтоўных прац па гісторыі паўстання: *Апошнія хвіліны Студзеньскага паўстання на падставе аўтэнтычных крыніц* <...>, *Гісторыя 1863 года*" [Каліноўскі 1999: 438] і інш.

[31] У 1864 г. В. Ратч быў прызначаны на пасаду начальніка артылерыі Віленскай ваеннай акругі. Віленскі генерал-губернатар М. Мураўёў даручыў яму скласці апісанне падзей паўстання 1863 г., даўшы магчымасць карыстацца архівам паўстання. "У яго *Сведениях о польском мятеже в Северо-Западной России (1867–1868)*, напісаных па даручэнні Мураўёва, ёсць унікальныя звесткі пра рэвалюцыйную тэорыю Каліноўскага" [Каліноўскі 1999: 438].

[32] Факт знаёмства К. Каліноўскага і В. Парафіяновіча, прызначэнне другога Камісарам Магілёўскага ваяводства неаднаразова зафіксаваны ў следчых дакументах па справе паўстання. Гэта можам прасачыць у наступнай храналагічнай паслядоўнасці ўзнікнення дакументаў. З паказанняў Парафіяновіча ў Віленскай асобай следчай камісіі ад 2 лютага 1864 г. вынікае, што прызначэнне ў Магілёў

*справе*) на Міншчыну з мэтай наладжвання там *стальнога парадку*. Такое рашэнне выклікае абурэнне з боку гаспадыні канспіратыўнай кватэры Юзэфы Яневіч[33]. Яна выступае тут больш мудрай і дальнабачнай у параўнанні з К. Каліноўскім. Ён жа ў гэтай сцэне імкнецца быць псіхолагам, але на самай справе кепскім, давяраючы адказную справу ненадзейнаму чалавеку, якога Яневіч характарызуе як зайздроснага чалавека, якому нельга верыць. Тым не меней, накіраванне Парафіяновіча на Міншчыну адбываецца.

> К а с т у с ь (*пасля паўзы*). Добра… Караліна не паедзе на Міншчыну…
> К а р а л і н а. А хто?
> К а с т у с ь. Ён…
> В і т а ў т. Туды ? Дзе развал?

ён атрымаў ад К. Каліноўскага у час першага з ім знаёмства пры наступных абставінах. В. Парафіяновіч з Мінска разам з Аскеркам накіраваўся ў Вільню. Там Аскерка завёў яго да Ямантаў. "Войдя туда, мы нашли Калиновского <…>. Оскерко сказал мою фамилию, но Калиновский про свою умолчал, говорил, что назначит меня комиссаром в Могилев. В то же время Калиновский объявил, что я должен отправиться в Петербург <…>. По возвращении из Петербурга в квартире Ямонтов опять нашел Калиновского и Милевича; первый, отпуская меня в Могилев, снова подтверждал употреблять меры затруднений <…>". [ Цыт. па: Каліноўскі 1999: 195–196]. У паказаннях ад 4 (або 5) лютага К. Каліноўскі, відаць, з меркаванняў бяспекі сцвярджае, што ён "в семействе Ямонта никогда не бывал и фамилию эту слышал только в Петербурском университете, но с самим студентом под этою фамилиею знаком не был" [*Следча-судовая справа*… 2014: 40]. Студент – тут маецца на ўвазе Іосіф Ямант, які "з лета 1863 г. быў сакратаром К. Каліноўскага, а з кастрычніка паўстанцкім камісарам Мінскага ваяводства; у студзені 1864 г. арыштаваны" [Каліноўскі 1999: 451]. Паказанні ж К. Каліноўскага ад 14 лютага 1864 г. утрымліваюць наступныя сведчанні: факт прызнання знаёмства з Іосіфам Ямантам і даручэнне Парфіяновічу – "предложил ему собрать и доставить мне какие-либо сведения о Могилевской губернии, но их вовсе не получил" [*Следча-судовая справа*… 2014: 45–46]. Паводле Доклада Особой Следственной Комиссии под председательством Полковника Шелгунова ад 27.02.1964 г., "Калиновский сознался, что имел непосредственные сношения с <…> Парфиановичем, и что последнему им, Калиновским, или Суходольским (Дормановским) выдана была номинация на звание Комиссара Могилевского воеводства" [*Следча-судовая справа*… 2014: 60].

[33] У сапраўднасці – Юзэфа Баневіч. Яе прозвішча згадваецца, напрыклад, у паказаннях К. Каліноўскага ад 30 студзеня 1864 г., у якіх ён адмаўляе факт знаёмства з гэтай асобай: "Баневич – я совершенно не знаю" [*Следча-судовая справа*… 2014: 29]. Тым не меней, у паказаннях В. Парфіяновіча ад 02.02.1864 г. (тэкст арыгінала Кого любишь? – Люблю Беларусь. – Так взаимно) зафіксаваны факт знаёмства Юзэфы Баневіч і Кастуся Каліноўскага: атрыманы Парафіяновічам у Магілёве пароль Каго любіш… быў выкарыстаны ім на явачнай кватэры Юзэфы Баневіч у Вільні. Гаспадыня кватэры Баневіч вывела Парфіяновіча на Каліноўскага [ гл.: Каліноўскі 1999: 351]).

> К а с т у с ь. Больш цяжкай працы няма... Не ўпэўнены – не едзь. <...> І ўлічы, там сапраўды цяжка. <...> Едзь. Марыш аб славе? Законна для тваіх год. Хочаш небяспекі? Таксама. Працаваць хочаш? Працуй. Вось табе Міншчына. Рабі там што хочаш. Але каб праз месяц быў стальны парадак. Не зробіш – адкажаш. Будзем ведаць: крыкі твае – шчанюкоў візг. Зробіш – вось табе твая слава і памяць у пакаленнях.
> <...>
> Я н е в і ч. <...> Не любоў галоўнае ў ім, зайздрасць!
> <...>
> К а с т у с ь. Ён – чалавек. Я не магу не верыць чалавеку [Караткевіч 2015, XI: 205–206].

Цяжка з поўнай дакладнасцю вызначыць, які гістарычны сэнс у праекцыю на асабовыя якасці К. Каліноўскага ўкладваў У. Караткевіч у гэтай сцэне (магчыма, *высокасць і гожасць* героя руны – прыгадаем *заўвагі* аўтара для акцёраў у сувязі з вобразам К. Каліноўскага). Тым не менш, гэтая сцэна з пазіцыі гістарычнай рэтраспектывы праецыруецца на ўспаміны Я. Гейштара, які адзначае, паводле яго перакanання, *поўнае няведанне людзей* К. Каліноўскім.

> Але Каліноўскаму не хапала самай важнай здольнасці для такой дзейнасці, не хапала ведання людзей. Выбар людзей, якім давяраў, быў па большай частцы фатальным. Гарачы, нястрыманы і прасякнуты крайнімі прынцыпамі, ён не любіў пярэчанняў; умеранасць у думках як наконт станаў, так і наконт унутраных стасункаў лічыў нястачай патрыятызму. <...> І нельга было Каліноўскаму сказаць, як ён памыляўся ў выбары падобных асоб: сам высакародны, занадта верыў іншым. <...> Як усе крайнія, ён не любіў апазіцыі, а таму акружаў сябе людзьмі, якія слепа з ім згаджаліся. То ў выбары людзей быў вельмі нешчаслівы; такія, як Заблоцкі, кс. Чаповіч, Мілевіч, Парфіяновіч, д-р Дзічкоўскі, былі яго крэатурамі, крыважэрнымі ў тэорыі і нікчэмнымі, калі давялося спаткацца з рэпрэсіямі [Каліноўскі 1999: 155].

Вітаўт Парафіяновіч як дзейная асоба п’есы мае свайго гістарычнага прататыпа. “Парфіяновіч (Парафіяновіч) Вітальд (у праваслаўі Іосіф, 1844 – ?), студэнт Кіеўскага ўніверсітэта; у 1863 г. паўстанцкі камісар Магілёўскага ваяводства; у студзені 1864 г. арыштаваны, выдаў адрас і псеўданім Каліноўскага, даў падрабязныя паказанні” [Каліноўскі 1999: 435]. Гэтыя гістарычныя факты ў п’есе *Кастусь Каліноўскі* ставяцца ў кантэкст адпаведных сцэн, якія, як і іншыя, па-мастацку псіхалагізуюцца з пазіцыі драматургічнага характару і паводле прынцыпу т а к м а г л о б ы ц ь.

Паводле аўтарскіх *Заўвагах для акцёраў*,

> Парафіяновіч – <...> дзевятнаццацігадовы няўдачнік. Камісар без ваяводства, разбіты без адзінага бою палкаводзец, каханак без каханай,

паўстанец без мужнасці, аплецены хітрым і страшным ворагам. У подласці ягонай прысутнічае нейкая веліч адчаю [Караткевіч 2015, XI: 239].

Допыты прататыпа Парафіяновіча (Парфіяновіча) у Мінску правадзіў палкоўнік Лосеў. "Лосеў – ні ў якім разе не дурань. Чалавек, магчыма, і не бліскуча адукаваны, але прыродна разумны. Хітрая і небяспечная асоба, сышчык па самай натуры сваёй" [Караткевіч 2015, XI: 239]. Такая выснова пісьменніка ў *Заўвагах для акцёраў пацвярджаецца* і ў самім творы: у пецярбургскай мастацка-падзейнай прасторы (карціна сёмая) абмеркаваннем Мураўёвым і Лосевым праблемы спынення сялянскага паўстання, а таксама ў мінскай мастацка-падзейнай прасторы (карціна дзясятая) правядзеннем допыту Лосевым Парафіяновіча. У апошняй з названых карцін твора Лосеў паказаны як глыбокі псіхолаг, які ўмела па-службоваму гуляе з асаблівасцямі псіхікі Парафіяновіча. Прыродная разумнасць Лосева, на якую звяртаў увагу У. Караткевіч, пацвярджаецца не толькі ў творы, а і (ускосна – для дадзенага кантэксту характарыстыкі: дапаўняецца такімі рысамі характару, як хітрасць, крывадушнасць) ва ўспамінах Людвікі Радзевіч (Ямант), якая мела дачыненне да паўстання[34], а таксама ў адной з *запісак* Аляксандра Масалова[35].

М. Мураўёў, калі падсумаваць заўвагі У. Караткевіча, – *чалавек з трагедыяй, разумны, жорсткі, страшны, жахлівы*.

[34] К. Каліноўскі "не меў у Вільні блізкіх, а сябры не маглі клапаціцца пра важных палітычных вязняў, бо гэта магло выклікаць зразумелыя ўскладненні, апеку над ім <…> узяла на сябе <…> удава Ядвіга Макржыцкая [у 1863 г. сувязная віленскай паўстанцкай арганізацыі, апекавалася К. Каліноўскім падчас яго зняволення ў турме]. <…> яна атрымала права дастаўкі Каліноўскаму неабходных рэчаў. Наладзіла пры дапамозе хабару жандарам магчымасць абмену сакрэтнымі запіскамі з вязнямі <…> запіскі, аплачаныя па 10 рублёў, часта траплялі ў рукі "бяскрыўднага" Лосева і толькі потым адрасату" [Каліноўскі 1999: 204, 430, 205].

[35] А. Масалоў – "чыноўнік канцылярыі М. Мураўёва" [Каліноўскі 1999: 431]. Паводле А. Масалова: "На пачатку 1864 г. вопытны жандар палкоўнік А.М. Лосеў быў камандзіраваны Мураўёвым з Вільні ў Мінск, дзе яму вельмі хутка ўдалося не толькі раскрыць структуры мясцовай арганізацыі, але і знайсці важныя ніці, якія выводзілі напраскі да ядра віленскага паўстанцкага цэнтра, да Каліноўскага" [Каліноўскі 1999: 375]. "В числе лиц, с которыми имел дело полковник Лосев, оказался [В. Парфіяновіч. – А. М.], наиболее посвященный во все тайны главных деятелей мятежа. Полковник Лосев понял это, обещал исходатайствовать ему помилование и воспользовался его открытиями. [В. Парфіяновіч. – А. М.] обнаружил не только главных двигателей мятежа и все перемены, происходившие в их составе, но и самое местопребывание Калиновского, с которым он был в ближайших сношениях. Шифрованная телеграмма с уведомлением об этом получена была в Вильно в 9 час. вечера; в ней были описаны приметы Калиновского и сказано, что он проживает с фальшивым паспортом гродненского дворянина Витольда Витоженца в Свенто-Янских мурах" [Каліноўскі 1999: 206].

Драматург у *Заўвагах для акцёраў* адзначыў, прынамсі, наступнае:

> <…> крый божа рабіць дурнямі ворагаў. Мураўёў, магчыма, нават разумнейшы за Кастуся (іначай перамога не адбылася яму так параўнаўча лёгка), але гэта ганебны розум бліскучага адміністратара дзяржавы катаў, розум, не сагрэты ні дабрынёю, ні вераю ў людзей. І, аднак, Мураўёў ч а л а в е к. Яму нельга д а р а в а ц ь, але яго можна з р а з у м е ц ь. <…> ён увесь час вымушаны (і не без поспеху) змагацца з самім сабой, з рудыментамі пакут сумлення. Выключна разумны, жорсткі. Як вораг – страшны. Як разбэшчвальнік душ – жахлівы. Як чалавек – увасабленне той смяротнай сілы, якая ва ўсе вякі гняла людзей. Сімвал адвечнай іерархіі начальства. Перст лёсу і крыві, які нібы забыў, што ён памрэ, як усе [Караткевіч 2015, XI: 237, 239].

Параўнанне прыведзеных вышэй Караткевічавых заўваг да асобы генерала М. Мураўева[36], а таксама гэтага вобраза з п’есы (карціны пятая, трынаццатая) і некаторых гістарычных характарыстык асобы М. Мураўёва, вынікаў яго дзейнасці ў Віленскім краі[37] прыводзіць да наступнай высновы. Эпізадычны вобраз генерала М. Мураўева, які прадстаўлены ў дадзеным творы, толькі часткова адпавядае паказальным праявам гэтай гістарычнай постаці як *графа-вешальніка*; найбольш ён напоўнены аўтарскім разуменнем матывацыі М. Мураўёвым выбару шляхоў змагання з паўстанцамі. Гэты паказчык з’яўляецца істотнай прыкметай мастацкай

[36] “Ці з’яўлецца Мураўёў двурушнікам? Не. Ён не прыкідваецца. Але хлусіць у кожным слове, у кожнай думцы. <…> З усёй той хлусні, якую сёння паўтарае ўвесь яго народ, у якую ён верыць, самым бессаромным і самым глыбокім з’яўляецца хлусня пра «спрадвечна расійскае насельніцтва, расійскае паходжанне і мову, пра расійскую народнасць, спрадвечна рускія тэрыторыі Літвы і Русі». Так хлусіць не ўмее ніхто ва ўсім свеце. Немец забірае і змагаецца, але такога не робіць; ён кажа: гэта заўсёды было тваім, але я гэта забіраю, бо я мацнейшы. Калі крадзе маскаль, здаецца, што ён робіць божую рэстытуцыю; і так дзёрзка, так доўга падманвае, што ў выніку заўсёды кагосьці ды падмане” [Tarnowski 1896: 16]. Аналізуючы перапіску 1859–1864 гг. М. Мураўёва і П. Валуева (з красавіка 1861 г. – кіраўнік Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі), В. Мустафін зрабіў наступныя назіранні (захоўваюцца ў Інстытуце рускай літаратуры ў Санкт-Пецярбургу): “Муравьев укрепил твердо в сознании русского общества идею, что Северо-Западный край – русский. Для проведения этой идеи ему приходилось вести неустанную борьбу с высшими петербургскими сферами, которые по словам Муравьева, не знали ни истории края, ни настоящего его положения, не знали и польского характера, а потому не могли понять мысли об окончательном слиянии того края с Россией, считая его польским, ставя ни во что все русское господствующее там население” [*Граф Михаил Муравьев-Виленский*..., online].

[37] “Выбар суровых і варварскіх сродкаў”, скіраваных на “супраціўленне” ў Віленскім краі “быў пакінуты Мураўёвым на волю павятовых ваенных начальнікаў, загадзя надзеленых правам жыцця і смерці над жыхарамі краю” (з рапарту ў Варшаву пра контрадрасы, 7(9) кастрычніка 1863 г. [цыт. па: Каліноўскі 1999: 115–116]).

версіі гістарычных фактаў, адлюстраваных у дадзеным творы. Пры гэтым варта адзначыць, што сцэны з намерамі пакаранняў паўстанцаў і самога іх пакарання ўскосна характарызуюць генерала М. Мураўёва як *віленскага ката, Вешальніка,* які *вырашыў скрышыць і зламаць, знішчыць і змесці*[38] паўстанцаў і тых, хто ім спачуваў.

Яшчэ адна дзейная асоба дадзенай групы п'есы *Кастусь Каліноўскі* – Гогель: *гэта не проста нягоднік – нягоднік з прэтэнзіямі*[39]. Гэтая аўтарская характарыстыка знаходзіць сваё падмацаванне ў тэксце твора (карціна дванаццатая). Паручнік Мікалай Гогель як член Асобай следчай камісіі ў Вільні прымаў удзел у допытах па справе паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, што засведчана яго подпісамі пад многімі дакументамі следства[40]. Апрача таго, некаторыя з дакументаў (*тлумачальныя запіскі* і інш.) па справе паўстання знаходзяцца ў архіве М.В. Гогеля (Гістарычны музей у Маскве) [Каліноўскі 1999: 352, 367].

Названыя вышэй і іншыя дзейныя асобы маюць аўтарскую характарыстыку непасрэдна ў тэксце. Яна ўкладваецца ў вусны тых драматургічных герояў, якія з'яўляюцца сведкамі іх учынкаў. Так, напрыклад, патэнцыйную здольнасць В. Парафіяновіча да здрады вызначае Юзэфа Яневіч (карціна дзявятая), а прычыну яго адмаўлення ад вочнай стаўкі з К. Каліноўскім коратка акрэслівае старшыня следчай камісіі палкоўнік Шалгуноў (карціна дванаццатая); сутнасць помслівага апазнання Марыяй Грэгатовіч К. Каліноўскага характарызуе палкоўнік Шалгуноў (карціна дванаццатая); спачувальнае і чалавечае жаданне Шоціка абараніць К. Каліноўскага ў час следства падкрэсліваецца аўтарскімі рэмаркамі і стылем маўлення гэтага героя п'есы (карціна дванаццатая) і інш.

## Ідэйная пазіцыя вобраза К. Каліноўскага

Адна з цэнтральных ідэй паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага – перадача зямлі сялянам і *ўвядзенне сялян на пасады арганізацыі*. У сувязі з гэтым адзначым супадзенне гістарычных (1863-га года) і мастацкіх (з п'есы) фактаў. Так, напрыклад, пасля прыезду *ў Гродна (канец студзеня – пачатак лютага 1963 г.)* [Герасімчык 2018: 176] К. Каліноўскі падрыхтаваў *Інструкцыю павятовым камісарам*, завера-

[38] Вызначэнні, зробленыя ў публіцыстычных тэкстах польскамоўнай падпольнай прэсы: карэспандэнцыі ў газетах "Niepodległość" ад 12.09.(31.08.) 1863 г. І "Głos z Litwy" ад 20(8).03.1864 г. [цыт. па: Каліноўскі 1999: 59, 75].

[39] "Г о г е л ь – <…> Праз некалькі год [пасля разгрому паўстання. – А. М.] яго пачне рваць друкаваным словам, і тады ён выпусціць кніжку, у якой будзе паклёпнічаць на Кастуся" [Караткевіч 2015, XI: 238].

[40] Справы ад 29.01.1864, 30.01.1864, 04.02.1964 і інш. [*Следча-судовая справа*… 2014: 23, 24–31, 37 і інш.].

ную *пячаткай урадавага камісара Гродзенскага ваяводства*[41]. Адзінаццаты пункт дадзенага дакумента вызначае наступнае: “Старацца ўвесці на пасады арганізацыі сялян, што належыць рэкамендаваць службовым асобам народнай арганізацыі” [Каліноўскі 1999: 101]. Паводле ўспамінаў Ежы Ігната Кучэўскага-Порай – былога афіцэра-інструктара (1863) у атрадзе Віславуха, К. Каліноўскі “шукаў той сілы, каб узняць народ да ўзроўню рыцара, што змагаецца ў імя патаптаных правоў чалавека. Ён адчуваў гэты агульны пульс у сялянах усёй Польшчы” [Каліноўскі 1999: 427, 173].

В. Пшыбароўскі адзначыў, што К. Каліноўскі “ў паўстанні бачыў найперш незалежнасць Літвы, а пасля сацыяльную рэвалюцыю. Таму дабіваўся перш за ўсё поўнага надзялення сялян зямлёй” [Каліноўскі 1999: 166].

Гэтыя гістарычныя факты знайшлі сваё адлюстраванне і ў трагедыі У. Караткевіча *Кастусь Каліноўскі* ў выказваннях яго галоўнага героя (напрыклад, карціна першая).

> Кастусь. <...> А колькі мужыкоў ідзе з намі! І тут, і на Магілёўшчыне, і паўсюль. І паўсюль, дзе перамагае іхняя сіла, – у мужыкоў зямля, воля, мова, слава [Караткевіч 2015, XI: 148].
> Кастусь. <...> Усуперак кіраўніцтву паўстання – трэба абапірацца на мужыка [Караткевіч 2015, XI: 149].

У п’есе адлюстравана непрыманне К. Каліноўскім і яго паплечнікамі пазіцыі *кіраўніцтва паўстання*, *белага віленскага ўрада*.

> Арсень. <...> Слухай мяне, Кастусь. Белы віленскі ўрад распаўся. Спалохаліся мураўёўскіх шыбеніц. Галава ўрада знік з Вільні ў невядомым кірунку. <...>
> Кастусь. Паўстанцы таксама розныя. Тыя, што вучылі вас пакоры, раілі вам не чапаць зямлі, – гэта людзі Белага жонду, а па-нашаму – урада. Яны толькі што ўцяклі з Вільні, спалохаліся. <...> А мы не спалохаемся. Мы, чырвоны ўрад, гаворым: зямлю – браць. Паноў лютых – вешаць. І благаслаўляем вас на гэта. Белыя здрадзілі – выспятка ім. Затое мы – за вас. Да канца [Караткевіч 2015, XI: 149–150).

Выказанай у вышэй прыведзенай цытаце пазіцыі К. Каліноўскага супрацьпастаўляецца ў творы іншая: адпрэчванне саюза з сялянствам

[41] “Датуецца часам знаходжання Каліноўскага на пасадзе гродзенскага камісара: канец сакавіка – пачатак чэрвеня 1963 г. Аўтарства Каліноўскага сумнення не выклікае – пра гэта сведчыць і сам энергічны стыль дакумента, і відавочны клопат аўтара адстаяць інтарэсы сялян. Аднак супастаўленне некаторых фактаў прымушае аднесці складанне інструкцыі <...> на час не ранейшы за 28.04., і нават 14.06. У апошнім выпадку Каліноўскі, мабыць, быў ужо ў Вільні, перадаўшы сваю пасаду Э. Заблоцкаму” [Каліноўскі 1999: 333].

у паўстанцкім змаганні, якая адлюстравана ў выказваннях Пасланца Белага жонду (карціна трэцяя).

> П а с л а н е ц. Як хочаце. Але варшаўскі белы жонд забараняе вам рабіць стаўку на хамаў…
> <…>
> П а с л а н е ц. Такое паўстанне нам непатрэбна. Мужык лезе ў яго бруднымі лапамі, а не лезе, дык прадае [Караткевіч 2015, XI: 158, 159].

Як адзначаецца ў *Каментарыях* да збору твораў У. Караткевіча ў 25 тамах, "практычна ўсе персанажы [трагедыі *Кастусь Каліноўскі*. – *А. М.*] – рэальныя гістарычныя асобы" [Караткевіч 2015, XI: 503]. Сам аўтар звярнуў увагу на тое, што "цалкам выдуманых сярод [дзейных асоб твора. – *А. М.*] амаль няма" [Караткевіч 2015, XI: 238].

Паводле нашых назіранняў і супастаўленняў, з 29 дзейных асоб п'есы (без уліку асоб з масавых сцэн) 15 маюць рэальных гістарычных прататыпаў. Іх дачыненні ў тым ці іншым выглядзе да падзей, адлюстраваных у творы, зафіксаваны ў судова-следчай справе (паказанні, подпісы пратаколаў, паказанняў і інш.) К. Каліноўскага, а таксама ва ўспамінах, даследаваннях сучаснікаў.

Прапанаваныя вышэй характарыстыкі і высновы адносна складнікаў мастацкага свету трагедыі *Кастусь Каліноўскі (Смерць і неўміручасць)* У. Караткевіча як мастацкай версіі гістарычных фактаў (час і месца падзей; падзеі і факты; гістарычныя постаці; ідэйная пазіцыя адлюстраваных гістарычных асоб, а таксама дапаможных для іх раскрыцця драматургічных вобразаў; складнікі аўтарскай мастацкай канцэпцыі ў выяўленні сутнасці гістарычных постацей і падзей) дазваляюць зрабіць наступныя высновы.

Адлюстраванне аб'ектыўных фактаў і падзей паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага ў іх гістарычнай дакладнасці (дакументальнасць мастацкага тэксту) драматург спалучае з карцінамі чалавечых ўзаемаадносін, улічваючы матывацыю міжасабовых і грамадзянскіх учынкаў, іх сутнасць і выніковасць. Такая рэканструкцыя гістарычных падзей і характараў у іх мае наступныя асаблівасці: 1) рассоўванне межаў гістарычнай прасторы, даступнай для аўтара на момант стварэння трагедыі, 2) пазбаўленне факта яго першапачатковага выгляду, 3) мастацка-суб'ектыўная афарбоўка гістарычнай прасторы сэнсам гіпатэтычнай праўды пра чалавечы характар у гістарычных абставінах; 4) аўтарскі суб'ектывізм дазволіў матывавана напоўніць гістарычную прастору мастацкага свету псіхалагічным станам дзейных асоб, а таксама іх персанальным правам на той або іншы асабовы ці грамадзянскі выбар; 5) адзначаны вышэй грамадзянскі выбар можа быць прымальны або

непрымальны з пазіцыі грамадзянскай эстэтыкі, аднак ён існуе – у гэтым заключаецца таксама яшчэ адзін бок гістарычных фактаў, якія даносіў У. Караткевіч праз мастацкі тэкст; 6) пісьменнік прапанаваў мастацкае ўяўленне пра гістарычную сутнасць змагарнага часу, яго падзеі, асобы, трагедыю і гістарычна-нацыянальнае яго значэнне.

## Спіс літаратуры


Gerasìmčyk Vasil. 2018. *Kanstancìn Kalìnoŭskì: asoba ì legenda*. Grodna [Герасімчык Васіль. 2018. *Канстанцін Каліноўскі: асоба і легенда*. Гродна].

Kavalëŭ Sârgej. 2014. *Mastackaâ ìntèrprètacyâ vobraza Kastusâ Kalìnoŭskaga ŭ belaruskaj dramaturgìì XX–XXI stst.* "Studia Białorutenistyczne" nr 8: 117–123 [Кавалёў Сяргей. 2014. *Мастацкая інтэрпрэтацыя вобраза Кастуся Каліноўскага ў беларускай драматургіі XX–XXI стст.* "Studia Białorutenistyczne" № 8: 117–123].

*Graf Mihail Murav'ev-Vilenksij (iz vospominanij i dokumentov)* [*Граф Михаил Муравьев-Виленский (из воспоминаний и документов)*] [online] https://zapad rus.su/bibli/arhbib/1186-graf-mikhail-muravev-vilenskij-iz-vospominanij-i-dok umentov.html [доступ: 18.03.2022].

Kalìnoŭskì Kastus'. 1999. *Za našuû vol'nasc'. Tvory, dakumenty*. Mìnsk: Belaruskì knìgazbor [Каліноўскі Кастусь. 1999. *За нашую вольнасць. Творы, дакументы*. Мінск: Беларускі кнігазбор].

Karatkevìč Uladzìmìr. 2015. *Zbor tvoraŭ u 25 t.* T. 11. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura [Караткевіч Уладзімір. 2015. *Збор твораў у 25 т.* Т. 11. Мінск: Мастацкая літаратура].

Kìsâlëŭ Genadz'. 1966. *Z dumaj pra Belarus'*. Mìnsk: Belarus' [Кісялёў Генадзь. 1966. *З думай пра Беларусь*. Мінск: Беларусь].

Ragojša Usevalad. 2008. *Staražytnyâ runy ŭ mastackìm svetaŭsprymannì Uladzìmìra Karatkevìča*. U: *Fal'klarystyčnyâ dasledavannì: Kantèkst. Typalogìâ. Suvâzì: zbornìk artykulaŭ*. Mìnsk: Bestprynt [Рагойша Усевалад. 2008. *Старажытныя руны ў мастацкім светаўспрыманні Уладзіміра Караткевіча*. У: *Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зборнік артыкулаў*. Мінск: Бестпрынт].

Ratč Vasilij. 1867*. Svedeniâ o pol'skom mâteže 1863 goda v Severo-Zapadnoj Rossii.* T. 1. Vil'na [Ратч Василий. 1867. *Сведения о польском мятеже 1863 года в Северо-Западной России.* Т. 1. Вильна].

*Sledča-sudovaâ sprava Kastusâ Kalìnoŭskaga*. Uklad. Z. Kuzmenka. Mìnsk 2014 [*Следча-судовая справа Кастуся Каліноўскага*. Уклад. З. Кузменка. Мінск 2014].

Tarnowski Stanisław. 1896. *Przedmowa wydawców*. W: *Pamiątniki hr. Michała Mikołaewicza Murawiewa (Wieszatiela)*. Kraków: Spółka Wydawnicza Polska.



**STRESZCZENIE**: W artykule charakteryzowane są następujące składniki świata przedstawionego sztuki U. Karatkiewicza *Kastuś Kalinouski* (*Śmierć i nieśmiertelność*) jako artystycznej wersji faktów historycznych: 1) czas i miejsce wydarzeń, 2) zdarzenia i fakty, 3) postacie historyczne, 4) pozycja ideowa przedstawionych postaci historycznych, 5) elementy koncepcji artystycznej autora dotyczące postaci i wydarzeń historycznych. Te wskaźniki przedstawionego świata dzieła świadczą o tym, że U. Karatkiewicz łączy przedstawienie obiektywnych faktów i wydarzeń z powstania pod kierownictwem K. Kalinowskiego w ich historycznej dokładności (dokumentalność tekstu literackiego) z obrazami stosunków międzyludzkich.

Jednocześnie pisarz koncentruje uwagę na motywacji działań interpersonalnych i obywatelskich, na ich istocie i skuteczności. Taka artystyczna rekonstrukcja wydarzeń historycznych i występujących w nich postaci z góry przesądziła o poszerzeniu granic prototypowej przestrzeni historycznej i subiektywnym wypełnieniu jej znaczeniem hipotetycznej prawdy o ludzkim charakterze w okolicznościach historycznych.

**SŁOWA KLUCZOWE**: artystyczny świat sztuki, tragedia *Kastuś Kalinouski* (*Śmierć i nieśmiertelność*), artystyczna wersja faktów historycznych, czas i miejsce wydarzeń, wydarzenia i fakty, postacie historyczne, pozycja ideowa bohaterów sztuki, motywacja do działań interpersonalnych i obywatelskich, składniki koncepcji artystycznej.

**АНАТАЦЫЯ**: Характарызуюцца складнікі мастацкага свету п'есы *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць* У. Караткевіча як мастацкай версіі гістарычных фактаў: 1) час і месца падзей; 2) падзеі і факты; 3) гістарычныя постаці; 4) ідэйная пазіцыя адлюстраваных гістарычных асоб, а таксама дапаможных для іх раскрыцця драматургічных вобразаў; 5) складнікі аўтарскай мастацкай канцэпцыі ў выяўленні сутнасці гістарычных постацей і падзей. Гэтыя паказчыкі мастацкага свету твора сведчаць пра наступнае. Адлюстраванне аб'ектыўных фактаў і падзей паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага ў іх гістарычнай дакладнасці (дакументальнасць мастацкага тэксту) драматург спалучае з карцінамі чалавечых узаемаадносін, улічваючы матывацыю міжасабовых і грамадзянскіх учынкаў, іх сутнасць і выніковасць. Такая мастацкая рэканструкцыя гістарычных падзей і характараў у іх вымагала рассоўвання межаў гістарычнай прасторы, даступнай для аўтара на момант стварэння трагедыі, і суб'ектыўнага напаўнення яе сэнсам гіпатэтычнай праўды пра чалавечы характар у гістарычных абставінах.

**КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ**: мастацкі свет п'есы, трагедыя *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць*, мастацкая версія гістарычных фактаў, час і месца падзей, падзеі і факты, гістарычныя постаці, ідэйная пазіцыя герояў п'есы, складнікі аўтарскай мастацкай канцэпцыі.

*Data przesłania artykułu: 15.09.2022*
*Data akceptacji artykułu: 03.10.2022*

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Aliaksandr Makarevich /Алесь Макарэвіч** – Białoruś**,** Uniwersytet Państwowy im. A. Kulaszowa w Mohylewie, Wydział Historyczno-Filologiczny, Katedra Literatury i Komunikacji Międzykulturowej, specjalność naukowa: literaturoznawstwo, zainteresowania naukowe: proces literacki 1900–1930, poetyka dzieł literackich, metodyka nauczania literatury.

**Adres**: Кафедра літаратуры і міжкультурных камунікацый, Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова, 212022 Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.

**Wybrane publikacje (2021–2022):**

1. Макарэвіч Алесь. 2021. *Аповесць І. Шамякіна* Сатанінскі тур: *асаблівасці мастацкага свету твора*. У: *Іван Шамякін – пісьменнік, акадэмік, грамадскі дзеяч. Да 100-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна*. Мінск: БДУ.

2. Макарэвіч Алесь. 2021. *Паэма Янкі Купалы* Сон на кургане: *асаблівасці мастацкага свету*. "Białorutenistyka Białostocka" №15: 135-158.
3. Макарэвіч Алесь. 2021. *Сістэма перспектыўных ліній пры характарыстыцы мастацкіх вобразаў лірычнага твора ў 5-м класе (на прыкладзе вершаў Максіма Багдановіча і Анатоля Грачанікава, V клас).* "Роднае слова" № 11: 66–70.
4. Макарэвіч Алесь. 2022. *Асаблівасці характарыстыкі мастацкіх вобразаў лірычнага твора на прыкладзе верша Янкі Купалы* А хто там ідзе? *(IX клас) (тэарэтычны аспект).* "Роднае слова" № 7: 61–63.
5. Макарэвіч Алесь. 2022. *Асаблівасці характарыстыкі мастацкіх вобразаў лірычнага твора на прыкладзе верша Янкі Купалы* А хто там ідзе? *(IX клас) (практычны аспект)*. "Роднае слова" № 8: 39–43.